**А. У. Сівак** (Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя І. П. Шамякіна)

## ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ НАЗВАЎ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ НІЗІННАГА ПАХОДЖАННЯ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Паводле характару рэльефу аронімы-апелятывы, ад якіх утварыліся населеныя пункты, могуць быць вышыннага і нізіннага паходжання. Яны характарызуюцца апазіцыяй значэнняў кампанентаў (верх-ніз) і аб'яднаны паняццем віду рэльефу (напрыклад: назва пасёлка *Высокі*, які знаходзіцца на высокім месцы, супрацьпастаўляецца назве горада *Глыбокае,* што знаходзіцца на нізкім месцы).

Існуюць два віды рэльефу: нізкагорны і высакагорны, якія падзяляюцца на дадатныя (выпуклыя – *узвышшы, хрыбты*), адмоўныя (увагнутыя – *упадзіны, катлавіны, даліны*) і плоскія (*гарызантальныя і нахіленыя раўніны*) [1, с. 259].

Кожная тэрыторыя мае свае асаблівасці форм рэльефу: калі для некаторых мясцін Расіі і Украіны спецыфічным лічыцца высакагорны від рэльефу, то для Беларусі ўласцівы нізкагорны: гэта *гара*, *града*, *востраў, грэбень*, *курган*, *груд* і інш. (напрыклад: *Альсагорка* [2, с. 29], *Востраў* [2, с. 99], *Грабяні* [3, с. 54] *Гіневічаў Груд* [2, с. 125], *Горкі* [3, с. 53], *Грыва* [3, с. 55], *Дзедаў Курган* [3, с.59], *Дубовая Града* [3, с. 62], *Сіні Востраў* [3, с. 155], *Халмы* [3, с. 172] і інш.).

МГПУ им. И.П.Шамякина

Адным з кампанентаў аронiма супрацьлеглага значэння, як гаварылася вышэй, з'яўляюцца назвы населеных пунктаў, утвораных ад апелятываў нізіннага паходжання (46 населеных пунктаў – 28,5 %). Назвы населеных пунктаў, суадносныя з узвышшамі, сустракаюцца часцей, чым назвы нізіннага рэльефу, таму што нізіну не заўсёды можа заўважыць чалавек, а ўзвышша служыць своеасаблівым арыенцірам на мясцовасці.

Апелятыў *нізіна* азначае нізкае месца або раўніну, якая знаходзіцца не вышэй 200 м. над узроўнем мора [4, с. 287]. Значыць, нізіна ўтварае нейкую ўпадзіну, паглыбленне або даліну, якая характарызуецца нізкім рэльефам у адносінах да верху.

Аранімічныя назвы нізіннага рэльефу характарызуюцца апелятывамі *алёс, балота, брод, даліна, зуб, канава, катлавіна, копанка, лог, машок, перакоп, плёсы, роў, тапіла, турок, яма*. Як від нізіннага рэльефу, яны абазначаюць:

*алёс* – нізкія мясціны, якія зараслі хмызняком [5, с. 56];

*балота* – поле на нізкім месцы [2, с. 57]; *брод* – глыбокі роў [5, с. 105];

*даліна* – нізіна, вялікая ўпадзіна паміж гор ці ўзгоркаў [5, с. 230]; *зуб* – поле на месцы балота [5, с. 315]; *канава* – неглыбокі і нешырокі доўгі равок з вострым вуглом трохкутніка ўнізе для сцёку вады, таксама абазначае выкапаны роў [5, с. 339];

*катлавіна* – паглыбленне, у якім звычайна стаіць вада і расце трава; яма [5, с. 350];

*машок* – балоцістае махавое месца; нізкі луг, які парос мохам [5, с. 423];

*перакоп* – перакапаны канавай перашыек паўвострава; роў; перакапанае ўзвышша паміж балотамі і азёрамі [5, с. 510];

*плёсы* – нізкае месца на заліўным беразе [2, с. 288]; *роў* – глыбокае, як канава, паніжэнне, якое вымыта веснавымі ліўнямі; штучная глыбокая канава; бяздонны сухі яр [5, с. 582]; *тапіла* – нізкае поле ці лес, якое ў час разводдзя і паводкі затапляецца вадой, непраходнае месца на дрыгнявістым балоце [2, с. 366];

*турок* – лог, поле, якія абмежаваны балотам, кустамі [5, с. 660]; *яма* – выкапанае або прыроднае паглыбленне ў зямлі, вялікая яма; нізіна [5, с. 715].

Як бачым, тэрміны-апелятывы маюць розную форму і характар утварэнняў, але ўсе яны адносяцца да ніжняга рэльефу і характарызуюць яго з розных бакоў. Таксама неабходна адзначыць, што гэтыя тэрмінаадзінкі могуць быць не толькі *адназначнымі*, але і *мнагазначнымі,* што сведчыць аб разнастайным характары беларускага ландшафту.

На ўзнікненне нізіннага рэльефу ўплываў не толькі прыродны фактар, але і гаспадарчая дзейнасць чалавека. Многія паглыбленні

МГПУ им. И.П.Шамякина

ўтварыліся ў часы Вялікай Айчынай вайны, а таксама пасля здабычы карысных выкапняў, меліярацыі, капання ям для мыцця бялізны і інш. Прыстасоўваючыся да розных умоў жыцця, людзі асвойвалі прыродныя багацці, у выніку чаго ўзнікалі паселішчы (напрыклад: *Канава* [3, с. 83], *Катловіна* [3, с. 86], *Копанка* [3, с. 89], *Сухое Балота* [3, с. 164], *Перакоп* [3, с. 135], *Ямнае* [3, с. 188–189] і інш.).

Некаторыя назвы населеных пунктаў цяжка растлумачыць, таму што яны могуць абазначаць адначасова і *верх*, і *ніз*, г. зн. яны характарызуюцца двухбаковасцю семантыкі (напрыклад: вёска *Дражня* ў дыялектнай мове мае назву "*даліна*" і тлумачыцца таксама як *горная даліна* [2, с. 157]; аснова назвы вёскі *Плёсы* суадносіцца з геаграфічным тэрмінам *плёс*, што абазначае "шырокі ціхі ўчастак ракі паміж перакатамі або астравамі", а таксама тлумачыцца як нізкае месца на заліўным беразе" [2, с. 288]).

Населеныя пункты, суадносныя з назвамі нізіннага паходжання, як і вышыннага, падзяляюцца на аднакампанентныя (26 адзінак – 56,5 %): *Балотня* [3, с. 26], *Брод* [3, с.33], *Даліна* [3, с. 57], *Заложжа* [3, с. 70], *Заямнае* [3, с. 73], *Канава* [3, с. 83], *Машок* [3, с. 110], *Перакоп* [3, с. 135], *Пераpоў* [3, с. 135], *Равішча* [3, с. 143], *Турок* [3, с. 168] і інш. і на двухкампанентныя (20 адзінак – 43,4 %): *Белае Балота* [2, с. 156], *Бярозавае Балота* [3, с. 36], *Гарэлае Балота* [3, с. 51], *Дубовы Лог* [3, с. 62], *Крыжовы Лог* [3, с. 94], *Пераpоўскі Млынок* [3, с. 135], *Ясная Даліна* [3, с. 189] і інш.

Такім чынам, нізінны характар рэльефу абумовіў узнікненне многіх геаграфічных назваў Гомельшчыны, якія яскрава сведчаць пра спецыфічныя асаблівасці розных утварэнняў ландшафту гэтага рэгіёну, асобныя назвы можна кваліфікаваць як пераходныя, нізінна-вышыннага паходжання.

**Літаратура**


1. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1973. – Т. 9. – 640 с.
2. Лемцюгова, В. П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды / В. П. Лемцюгова. – Мінск: Литература и Искусство, 2008. – 416 с.
3. Рапановіч, Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гомельскай вобласці / Я. Н. Рапановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 240 с.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. / пад рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск: БелСЭ, 1978. – Т. 3. – 768 с.
5. Яшкін, І. Я. Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія. Гідралогія / І. Я. Яшкін. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 808 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина